**УДК 39 (476-22) (091)**

# ПАСЛЯВАЕННАЕ ЖАБРАЦТВА Ў ДЫСКУРСЕ ВУСНАЙ ГІСТОРЫІ ВІЦЕБШЧЫНЫ[1]

***канд.гіст.навук, дац. А.В. СУМКО***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаецца пасляваеннае жабрацтва як адмысловая практыка ў сістэме жыццезабеспячэння вясковага насельніцтва ў складаных эканамічных умовах. У якасці крыніц выступілі матэрыялы вуснай гісторыі, якія дазволілі зразумець спецыфіку абранай праблемы і ахарактарызаваць адметнасці рэпрэзентацыі феномена паваеннага жабрацтва ў калектыўнай памяці вясковага насельніцтва Віцебшчыны.*

***Ключавыя словы:*** *пасляваенная вёска, вусная гісторыя, Віцебская вобласць, жабрацтва, старцы, голад, стратэгія жыццезабеспячэння.*

**Уводзіны**. Феномен жабрацтва ўзгадваецца ў розных культурах. Пад гэтай соцыякультурнай з'явай разумеецца сістэматычнае прашэнне міласціны ў незнаёмых людзей, якая з'яўляецца для жабрака асноўным сродкам жыццезабеспячэння. У канцы XIX ст. з'яўляюцца даследаванні, якія аналізуюць гэты спецыфічны промысел, яго прыроду і вылучаюць катэгорыі жабракоў. Найбольш яскрава дадзены феномен прадстаўлены ў этнаграфічных працах, дзе прадметам даследавання выступаюць перш за ўсё рытуальна-сімвалічныя аспекты жабрацтва і дваісты сацыяльны статус жабракоў у традыцыйным беларускім грамадстве. Яшчэ ў канцы XIX ст, аналізуючы соцыякультурны ландшафт Беларускага Падзвіння, М.Я. Нікіфароўскі пазначаў, што "старцы-жебракі" ў народных уяўленнях выступалі пасрэднікамі паміж светам жывых і памерлых, успрымаліся вяскоўцамі як "божыя людзі". Разам з тым ён адзначаў, што жабракі знаходзіліся па-за сацыяльнай структурай вёскі і ў зносінах з імі захоўвалі дыстанцыю. "Да "старца" падыходзяць на самы кароткі час, каб падаць міласціну, з ім гавораць толькі ў межах таго, за чыю "душаньку" творыцца падаянне" [1, с. 17]. Крыўда ці выпадкі падману жабракоў былі вельмі рэдкімі, бо лічылася, што гэта адбівалася на памерлых продках чалавека, што схібіў [2, с. 343].

Жабракоў (старцаў) аб'ядноўвала адзіная стратэгія жыццезабеспячэння, але яны адрозніваліся матывамі і практыкавалі розныя мадэлі паводзін. М.Я. Нікіфароўскі падзяляў жабракоў на "выпадковых" і "прафесійных" і адзначаў, што "чым цяжэй год у сельскагаспадарчым вымярэнні, тым большая колькасць "выпадковых старцаў" блукае за міласцю, то ў адзіночку, то ўдваіх, асабліва браты і сёстры. У больш цяжкіх абставінах з малалеткамі выходзяць старыя. "Выпадковыя старцы" з'яўляюцца каля Філіповак, блукаюць да Раства....знікаючы па меры набліжэння палявых работ. ...тады застаюцца на вольным свеце прафесійныя "старцы""[1, с. 19–20]. Прымаючы падзел жабракоў на "выпадковых" і "прафесійных", даследчыкі XIX – пачатку XX ст. на падставе эмпірычнага матэрыяла вылучалі тыповыя рысы перш за ўсё "прафесійных" старцаў. Што датычыла "выпадковых", то адзначалася, што "часовыя жабракі нічога тыповага з сябе не ўяўляюць. Гэта тыя ж сяляне, якія часова надзелі торбу. "Збярэ пагарэлец, што трэба для будаўніцтва ... абміне галеча ў селяніна, пацярпелага ад няўрода і ён здыме з сябе торбу, прымецца за гаспадарку" [3, с. 5–6].

Тэма жабрацтва, як промысла адмысловай сацыяльнай групы "старцаў", гучыць і ў матэрыялах вуснай гісторыі, якія адлюстроўваюць з'явы 1920-х – 1930-х гадоў. Што датычыць наратываў пра жыццё пасля вызвалення ад нацыстаў і перыяд пасляваеннага аднаўлення, то яны фіксуюць феномен "вымушнага жабрацтва", які з аднаго боку дэманструе ўзнаўленне практык "класічнага жабрацтва" XIX – пачатку XX ст., а з другога боку – прафанацыю сакральнага статуса "старцаў", бо на першы план выходзіла ўтылітарная прагматыка жыццезабеспячэння, а рытуальныя і магічныя практыкі альбо цалкам адсутнічалі, альбо выяўляліся ў рудыментарных, фармальных варыянтах.

Даследаванне феномена пасляваеннага жабрацтва мае адносна непрацяглую традыцыю. Найбольш поўна яно прадстаўлена ў расійскай гістарыяграфіі, у межах якой даследуюцца заканадаўчыя аспекты дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да жабракоў у другой палове XX ст. [4], а само жабрацтва разглядаецца як эфектыўная сацыяльная практыка (праява "сацыяльнага імунітэту"), заснаваная на культурнай пераемнасці базавых класічных жабрацкіх стратэгій дарэвалюцыйнага перыяду [5]. Што датычыць айчыннай гістарыяграфіі, то праблема пасляваеннага жабрацтва не стала прадметам асобнага даследавання. Яна ўскосна разглядалася ў рэчышчы пасляваеннага голада і стратэгій выжывання насельніцтва ў складаных умовах [6; 7].

Геаграфія даследавання – сучасная тэрыторыя Віцебшчыны, якая ў пасляваенны час (з 1944 па 1954 год) была прадстаўлена дзвюма абласцямі: Полацкай і Віцебскай, сацыяльна-эканамічныя адрозненні паміж якімі былі абумоўлены ўключэннем у склад першай раёнаў (Браслаўскі, Відзаўскі, Глыбоцкі, Дзісненскі, Докшыцкі, Дунілавіцкі, Міёрскі, Плiскі і Шаркаўшчынскі), што да 1939 г. уваходзілі ў склад Польшчы, дзе пераважала прыватная ўласнасць на зямлю і аднаасобная гаспадарка. У выніку рэгіён меў у сваім складзе раёны з рознымі тыпамі сацыяльна-эканамічнага ўкладу, розным узроўнем дабрабыту насельніцтва і неаднолькавымі стартавымі ўмовамі пасляваенага аднаўлення. Вывучэнне пасляваеннага жабрацтва з пазіцый антрапалагічнага падыходу і этнаграфічнага метаду збору інфармацыі на прыкладзе пэўнага рэгіену дае

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках праекта БРФФД-РФФД "Субкультура детства в дискурсе устной истории, языке и фольклоре Витебско-Псковского пограничья XX – начала XXI века", дамова № Г20Р-095.

магчымасць дэталёва прааналізаваць праблему, вызначыць характэрныя рысы азначанага феномена. Храналагічныя межы пасляваеннага жабрацтва ахопліваюць не толькі першыя гады пасля вызвалення, але 1946/47 год, калі засуха і няўроды актуалізавалі праблему фізічнага выжывання.

**Асноўная частка.** Пасля вызвалення разглядаемы рэгіён знаходзіўся ў цяжкім эканамічным становішчы. Агульная колькасць сельскага насельніцтва Віцебскай вобласці (14 раёнаў) на 1 студзеня 1945 г. складала 433, 8 тыс. чалавек (61% ад даваеннай колькасці), па ўсходніх раёнах (6 раёнаў) Полацкай вобласці – 123,5 (52,3%), па заходніх раёнах (9 раёнаў) Полацкай вобласці – 241, 2 (75,5%) [8, с. 241–242]. У надзвычай экстрэмальных умовах апынуліся жыхары тых раёнаў, дзе нацысты ў барацьбе з партызанамі праводзілі палітыку "выпаленай зямлі". "*Уся дзярэўня згарэўшы. На пянёк сталі, пастаялі, пакруціліся, нічога не было…*"[2] (Расонскі р-н); "*А на вясну мы прыехалі. 23 апрэля мы прыехалі, так, а што ж мы прыехалі?! Стаяць коміны і ўсё*" [3] (Пастаўскі р-н). Шэсць усходніх раёнаў Полацкай вобласці (Асвейскі, Ветрынскі, Дрысенскі, Полацкі, Расонскі, Ушацкі) і сем раёнаў Віцебскай (Гарадоцкі, Дубровенскі, Сіроцінскі, Суражскі, Чашніцкі, Лёзненскі, Мехоўскі) былі ўключаны ў лік 36 найбольш пацярпелых ад нацыстаў на тэрыторыі БССР [9, л. 10]. Паказальнай можа з'яўляцца сітуацыя ў вызваленым Расонскім раёне, дзе з 16 сельскіх саветаў у 10 былі цалкам знішчаны ўсе грамадзскія і жылыя забудовы, сельскагаспадарчы інвентар і дамашнія жывёлы, а з 38 000 даваенага насельніцтва засталося 17 508 чалавек, якія ва ўмовах ваеных дзеянняў 1944 г. пасяўныя работы не праводзілі [10, л. 13]. Частка насельніцтва Расонскага раёна амаль год хавалася ў лясах, а частка была эвакуіравана ў раёны Каліненградскай вобласці. Пасля вяртання на вызваленую тэрыторыю людзі жылі ў зямлянках, лазнях, непрыстасаваных для пражывання памяшканнях. Згодна з архіўнымі данымі без прытулку засталіся 37, 3% сельскага насельніцтва Віцебскай вобласці, 34% – Полацкай вобласці [9, л. 35]. Частка насельніцтва, пасля вызвалення ў 1944 г., пакідала спустошаныя раёны і сыходзіла ў ацалелыя раёны Беларусі, а таксама ў Літву і Латвію. Напрыклад, у Ашмянскім раёне, які лічыўся багатым і ўраджайным краем, паводле партыйных даных, у жніўні 1945 г. пражывала 1700 сем'яў бежанцаў з Віцебскай і Мінскай абласцей [7, с. 102]. Тыя, хто заставаўся, былі вымушаныя змагацца за выжыванне, максімальна выкарыстоўваючы ўсе наяўныя рэсурсы.

Успаміны вяскоўцаў фіксуюць, што вельмі актуальнай была праблема фізічнага выжывання на спустошанай тэрыторыі, калі пагроза гвалтоўнай смерці знікла, а на першае месца выйшла пагроза смерці ад голаду: "Пасля вайны нічога год не пахаўшы… Нічога не было" (Расонскі р-н) [11, с. 67]. У ежу ішло ўсё, што можна было есці: *Страшны голад быў. Коні здахалі, людзі падлу елі*" [4](Расонскі р-н); "*Траву во елі эту. Шчавель расцёт такі... Сморгалі і пяклі эты ляпёшкі*"[5] (Полацкі р-н). Неабходна адзначыць, што вусны дыскурс голаду і экстрэмальнай гастранаміі фіксуецца пераважна ва ўсходніх раёнах рэгіёну [11, с. 72]. Аднаўленыя ў першы год пасля вызвалення калгасы знаходзіліся ў вельмі цяжкім стане, асабліва ў раёнах найбольш пацярпелых ад нацыстаў, таму магчымасці эканамічнай дапамогі былі вельмі абмежаваныя. "*Да вайны нічога было, і робілі, і стараліся, а пасля вайны галадавалі крэпка, цяжка было жыць. Калок запішуць. Давалі на яго якога хлеба. А які хлеб быў? Гірса была. Трудадні.. ну, як валы робілі*" (Полацкі р-н)[6].

Жыхары спаленых вёсак, каб элементарна выжыць, вымушаны былі займацца жабрацтвам і брацца за любую працу дзеля кавалка хлеба. Аб'ектыўна маршруты жабракоў і парабкаў пралягалі ў куды больш "сытыя" раёны Заходняй Беларусі: "*А тады жабраваць мама хадзіла ў Храброва (на той старане, за Дзьвіной). Паехала, і адзін дзень нет, і другі. А яна там у бабкі была, трое рабятак, мужыка яе забілі там, у западнай, там дзярэўня, ну і мама мая асталася. Папрасіла тая бабка, каб дроў парэзаць і насочкаў рабяткам навязаць, ну, мама мая гэта ўмела. Толькі ў хату прыйшла: "Ну, садзісь, кажа, я цябе пакармлю". Наліла, кажа, мне капусты, а як ёсць мяса так і капуста разумная. А я ж хацела естачкі, я схваціла, кажыць, а яна гарачая, абпаліла ва рту, есць хачу, а рот увесь падняўся. …мама ёй там усё справіла: і насочкаў навязала,і ў хаце прыбрала, і баньку вытапіла, ну, яна можа якога чыну была, была багатай, з хлебам*" (Верхнядзвінскі р-н)[7].

У адносінах да людзей, якія прасілі міласціну, прымяняўся тэрмін "жабрак" ці "старац". Этнаграфічныя крыніцы сведчаць, што ў XIX – першай трэці XX ст. распаўсюджанай назвай былі "старцы": "пад словам "старац" паўсюдна ў Віцебскай Беларусі разумеецца чалавек, даведзены жыццём да горкай неабходнасці прасіць у чульлівых людзей першай жыццёвай патрэбы – кавалка надзённага хлеба" [1, с. 17]. М.Я. Нікіфароўскі пазначаў, што на Віцебшчыне такая назва адносілася да ўсіх, незалежна ад таго, хто прасіў міласціну: старыя, людзі сярэдняга ўзросту ці дзеці. Гэта традыцыя захоўваецца і ў матэрыялах вуснай гісторыі XX ст.: "А вот жабракі тут ці хадзілі? Старцы ці жабракі? – *Хадзілі, хадзілі, ой тады хадзілі.* –Дык гэта ўжо после вайны? А вот да вайны ці хадзілі? – *Ой, да вайны я не скажу вам. Не знаю етага. А после вайны хадзілі, хадзілі. Тады ў нас стораж, ужо бежанка была з унучкай, хадзіла па вочарадзі, кармілася.* – Дык, а вот як іх называлі? Старцы ці нішчыя, жабракі? Як звалі такіх людзей? – *Старцы.* – Старцы? – *Старцы і ўсё. Па-нашаму, па-простаму.*

[2] Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (ФА ПДУ) : Зап. Сумко А. у 2019 г. ад Кандрацьевай Надзеі Антонаўны, 1928 г. , в. Янкавічы Расонскага р-на.

[3] Зап. Грэбень Я., Корсак А., Сумко А. у 2017 г. ад Галоўка Анны Ігнатьевны, 1935 г.н., в. Міські Пастаўскі р-н.

[4] ФА ПДУ : Зап. Сумко А.В. у 2019 ад Высоцкай Таісії Іванаўны, 1935 г.н, у в. Галоўчыцы Расонскага р-н.

[5] ФА ПДУ : Зап. Лобач. У., Сумко А. у 2018 г. ад Рудзёнка Фёдара Антонавіча, 1937 г. н, в. Загацце Полацкага р-на.

[6] ФА ПДУ: Зап. Лобач У., Сумко А. у 2018 г. ад Маісеенка Марыі Філіпаўны, 1931 г.н. у в. Мураўшчына Полацкага р-на.

[7] ФА ПДУ : Зап.Сумко А. у 2018 г. ад Гайбут Веры Кірылаўны, 1941 г.н. у в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.

*Старцы, і я старчоўка была.* – Старчоўка? – *Старчоўка.* – І дажэ еслі дзеці хадзілі, так называлі, да? – *А як жа. Усё роўна, якая разніца?"* (Шумілінскі р-н)[8]. Вяскоўцы ў сваіх успамінах пра перыяд пасляваеннага аднаўлення пры ідэнтыфікацыі феномена выкарыстоўваюць вызначэнне і "старац", і "жабрак": "*Многа з голаду паўмірала ў Валатоўках, а мы не, мы не памёрлі, мы з сястрой хадзілі, ну як…па жэбрах, па старцах.*" (Расонскі р-н)[9].

Палявыя даследаванні фіксуюць успаміны пра жабрацкія практыкі ва ўсіх раёнах Віцебшчыны. Прычым аналіз матэрыялаў вуснай гісторыі паказвае, што калі ва ўсходніх раёнах успаміны пра пасляваеннае жабрацтва – гэта ўспаміны пра ўласны жыццёвы досвед, то ў заходніх пераважаюць успаміны сведкаў гэтай з'явы: "– А ці хадзілі жабракі? – *Хадзілі, асобенно, после вайны крэпка многа было жабракоў*"[10] (Глыбоцкі р-н); "*Кароча к нам, а мы самі пачці галадалі, і к нам каждый дзень па дзесяць чалавек прыхадзілі: "Што-небудзь дайце". Каму бульбіну, каму дзве, каму ляпёшку, каму бліночак, каму какой заціраччкі даш паесці – людзі галодныя*"[11] (Міёрскі р-н). Палявыя матэрыялы сведчаць, што прашэнне міласціны давала магчымасць не толькі пазбегнуць галоднай сьмерці, але і атрымаць рэсурсы для аднаўлення асабістай гаспадаркі: "*..бульбу мы як па старцах хадзілі, то людзі давалі нам бульбу і мы тады неяк развялі*" (Расонскі р-н)[12].

У галодны час, жабрацтва як адмысловая мадэль паводзінаў і эфектыўная стратэгія жыццезабеспячэння станавілася ўзорам для пераймання: "– *Хаділі па старцах, хаділі. Многа хаділа і деці хаділі. Даже адін раз сама хаділа. Думаю, ну все же ходят і я пайду. В адну хату зашла – пакармілі, в другую хату зашла – далі два бурачка красненькіх. Пашла, где бальшая семья, где многа детей было, іх там і послеваенные і ваенные, всякіе. Я захажу, а ані все сідят за сталом. Цётка Марья раздвінула децей, паставіла мне міску і налажыла, как сейчас помню, картошка вареная была. Вот стала я адхадіць дамой, а ана гаваріт, што падажді, не уході, а я ж не прасіла нічего, а ані меня так прынялі, што я растерялась. Я не думала, я не знала, што оні там живут, эта бальшая такая сем'я. І ана мне с сабой, какой-то хлеба кусок дала, палажыла то лі скварку какую, то лі што. Я прішла дамой шчасліваая, а мама плакала, так мама плакала. "Дачушка, не нада нікагда больше, не нада, не хадзі. Будзеце вы накормлены.*"– Вы пошли, просто, что все ходили? – *Все хаділі. Гаварілі: "Ай, пашла па беднасці". І я пашла па беднасці. Нада ж праверіть как это.*"[13] (Полацкі р-н).

Жабрацкія маршруты залежалі ад розных фактараў: геаграфія пражывання, фізічныя магчымасці, узрост, сямейныя абставіны. Напрыклад, з Расонскага раёна, больш хадзілі ў Полацкі, у тыя вёскі, якія не адсяляліся падчас вызвалення. "– Куды жабраваць хадзілі? – *Мы хадзілі…раз яны жылі, іх не эвакуіраваў ніхто, яны агароды пахалі. Мы і хадзілі, Баравуха, ай, якія дзярэўні былі туды і хадзілі. Наберым што-небудзь, давалі людзі. Прынясем дамоў. Мама балела сільна. Мы прыйдзем з сястрой, а тады пойдзем у лес, жылі каля лесу блізенька, дроў нацягаем ей і апяць пашлі, так і выжылі. Мы па аднаму месту цягаліся. Нас ужо знали*"[14] (Расонскі р-н). Старыкі і падлеткі, збольшага хадзілі радыяльна, на недалёкія адлегласці, па адных і тых жа населеных пунктах. Аднак голад вымушаў пераадольваць і большыя адлегласці: "– А ў Западную хадзілі? – *Гэта ж далёка было. Помню, сабраліся ідці, гэта яшчэ 45 год быў, яшчэ вайна не кончыўшыся была, мама і яшчэ тры жэншчыны з Валатовак, ну і я папрасілася. Вот мы ішлі на Боркавічы, тады і прыйшлі ў Дзісну, а ўжо Дзвіна была атышоўшы ад берагу.. і дождж ліў. Мы пахадзілі, ніхто нам нічога не даваў. Мне з Кацей па скібачке хлеба далі і ўсе, а гэтым нічога. І мы апяць вярнуліся ў тыя Боркавічы і ногі распухлі, столькі прайшоўшы. Гэта можа март быў.*"[15] (Расонскі р-н); "*Ой, ой, як ішлі з гэтага.. парцізанская зона была, … Расоны, во, з Расон ішлі. Іші, пабяралісь. Ну, праўда, папа нікому не адказаў, хоць нескалька бульбін укінець, хоць што-небудь"*[16] (Міёрскі р-н). Іншы раз, каб дабрацца да заходніх раёнаў, рызыкуючы жыццём, чапляліся за таварнякі, якія памяншалі хуткасць на пэўных участках чыгунцы: "*Ну, вот торбачку возьмеш і пойдзеш. А што, калі ўсе галодныя?! Ездзілі ў эту самую, дальшэ туды, у Рыгу, у Латвію ездзілі, у Западную сюды, там жа там лепей жылі. І я ездзіла з маткай. Зойдзеш у хату – пакормяць. Што-нібудь там: баначку мукі усыпіць, хто круп, хто кусочак хлеба дасць. Хто што мог даць, то давалі. Ну і саберыцца торба. А тады як жа ідці?Паязды ж хадзілі, таварнікі, ну і тады падойдзеш к этаму таварніку, прыцішыць ход трошачку, там у Палаце, і бывала мяне скінець матка, а тады і сама, пад аткос паляцім, падымімся і…"*[17] (Полацкі р-н).

Жыхары пацярпелых раёнаў, якія знаходзіліся недалёка ад былой польска-савецкай мяжы, хадзілі пераважна ў заходнюю частку Віцебшчыны, якая была ў лепшай гаспадарчай сітуацыі, чым разбураныя ўсходнія раёны: "*Ішлі-ішлі-ішлі ўсе яны, жабракі гэты, сюды. Тутака багацей жылі, сюды шлі, за Дзвіну, цераз паром..."*[18] (Міёрскі р-н); "*У нас, у Западнай Беларусі здесь было единаличество, людзі жылі намного*

[8] ФА ПДУ : Зап. Аўсейчык У., Лобач У. у 2018 г. ад Суханавай Кацярыны Іванаўны, 1932 г.н. у в. Сіроціна Шумілінскага р-на.

[9] ФА ПДУ : Зап. Сумко А. у 2019 г. ад Высоцкай Таісіі Іванаўны, 1935 г.н. у в. Галоўчыцы Расонскага р-н.

[10] ФА ПДУ : Зап. Аўсейчык У. у 2012 г. ад Вышадка Чаславы Пятроўны, 1937 г.н. у в. Хоцькі Глыбоцкага раёна.

[11] ФА ПДУ : Зап. Сумко А. у 2019 г. ад Якіменка Ліліі Якаўлены, 1931 г.н. у г. Дзісна Міёрскага р-на.

[12] ФА ПДУ : Зап. Сумко А. у 2019 ад Высоцкай Таісіі Іванаўны, 1935 г.н. у в. Галоўчыцы Расонскага р-н.

[13] ФА ПДУ : Зап. Сумко А. у 2019 г. ад Станоўка Ніны Браніславаўны, 1937 г.н. в. Быстрыца Палацкага р-на.

[14] ФА ПДУ : Зап. Сумко А. у 2019 ад Высоцкай Таісіі Іванаўны, 1935 г.н. у в. Галоўчыцы Расонскага р-н.

[15] ФА ПДУ : Зап. Сумко А. у 2019 г. ад Высоцкай Таісіі Іванаўны, 1935 г.н, у в. Галоўчыцы Расонскага р-н.

[16] ФА ПДУ : Зап. Лобач У. у 2019 г. ад Тэклі-Тэрэзы Патрымайла, 1929 г.н. у г. Дзісна Міёрскага р-на.

[17] ФА ПДУ : Зап. У. Лобач, А. Сумко ў 2016 г. ад Палавой Маі Паўлаўны, 1937 г.н. у в. Казімірова Полацкага р-на.

[18] ФА ПДУ : Зап. Мякшыла М. у 2019 г. ад Маняк Раісы Васільеўны, 1939 г.н. г. Дзісна Міёрскага р-на.

*багаче. Былі запасы і мяса, і сала і хлеба і ўсё. I паэтаму сразу после вайны хадзілі нішчыя."*[19] (Міёрскі р-н). "*Прыйшла адна цётка і гаворыць: "Можа ў вас хлеба кусочак ёсць? Дзесяць дзетак на пячы сядзяць і плачаць, есці хочуць". Паў булкі абрэзала і дала.* ***Жабравалі, хадзілі асобенна з васточнай стараны. –*** А чаму асобенна з васточнай? – *Таму, што там голад быў страшны, тут багацейшыя людзі былі, былі палякі*"[20] (Міёрскі р-н); "*У мяне папа ў 45-м вярнуўся ранены. Тады гэтыя васточнікі і хадзілі, гэтымі гадамі. Да, да, з торбамі. Каму дзе што рабілі, і служылі, і жалі, і ўсё на свеце*" (Глыбоцкі р-н).

Адносная заможнасць жыхароў заходніх раёнаў у параўнанні з гаротным станам сялян з Усходу актуалізавала падзел на "заходнікаў" і "ўсходнікаў" з шырокім спектрам узаемных сацыякультурных стэрэатыпаў: "*Былі такія две клічкі, былі "западнікі" і "васточнікі". Гэта ўжо больш хадзілі "васточнікі", патаму што ў "заподнікав", в западзе ж как-нікак адналічна жылі і ў іх была астаўшысь і зерна больш там, і кабана какова-нібудзь можа вырашчывалі. А ў васточных – калхозы былі, там былі болей бедные*"[21] (Міёрскі р-н). Паказальным з'яўляецца запіс, зроблены ў 2019 г. падчас экспедыцыі Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Міёрскім раёне, дзе падзел паміж "васточнікамі" і "западнікамі" тлумачыўся рознымі адносінамі да рэлігіі і маёмаснага стану: "– Ну и в чем отличия? – *Во-первых, отличаются очень в религиозном плане. Восточные – это и полное неверие, это и никаких особых икон в доме, и там никаких исповедей. Все эти обряды, там исключены.* – Ну, а по характеру, по отношению? – *Я бы сказала, восточные они были более прогрессивные, т.е. цивилизованные, как бы вам сказать…* – Восточные? – *Да, восточные, более цивилизованные, чем западные. Тут ещё долго ходили в лаптях всяких: и лыковых, и верёвчетых, а вот там этого не было.* – А как к «западникам» относились там? *Ну, знаете, мне такое вот кажется было отношение пренебрежительное. Вот они как-то понимали, что это были более отсталые, может быть, может зажиточные.* – Более богатые? – *Да, более богатые, поэтому какая-то неприязнь была*"[22] (Міёрскі р-н). У сваю чаргу, "усходнікі" маглі атаясамлівацца з савецкімі парадкамі, з іншай сістэмай каштоўнасцей і тады спрацоўваў механізм непрыняцця: "*Няхай вас Сталін корміць*"[23] (Міёрскі р-н).

Неабходна адзначыць, што пасляваеннае жабрацтва было вынікам не толькі катастрафічнага стану насельніцтва ад разбуральных наступстваў падчас Вялікай Айчыннай вайны, але і няўроду 1946 г. Напрыклад, у Віцебскай вобласці на 14 красавіка 1947 г. налічвалі каля 5 тысяч знясіленых і хворых ад голаду [6, с. 249]. Вусны дыскурс голаду гучыць ва ўспамінах пра першыя пасляваенныя гады, прычым у заходніх раёнах ён тлумачыўся як кара за атэістычную палітыку савецкай улады: "– А як жылося пасля вайны? – *После вайны, у нас в вайну яшчо хлеб быў, а после вайны, Бог даў, што не стала. У нас не хлеба, не бульбы нічога, так даждём заліло. Знішчалі цэркві, касцёлы, каб нічаго не было. А Бог наслаў дажджь такі, ну і гэтак, гэтак дажджь ліў дзень і ноч. Жыта на зіму не пасеялі, бульба згніла. Голод быў, траву елі. 1946 год гэта голод быў*"[24] (Міерскі р-н).

Параўнальны аналіз успамінаў пра выжыванне пасля вызвалення і этнаграфічных крыніц XIX – пачатку XX ст. сведчыць пра наяўнасць устойлівых стратэгій і практык жабрацтва ў часе і пераемнасць мадэляў паводзін, прынятых ў субкультуры жабракоў. Механізмы падобнай пераемнасці вынікаюць са спецыфікі жыцця, калі сям'я аб'ядноўвала некалькі пакаленняў і старэйшыя, праз аповяды, якія яны чулі ад сваіх бацькоў і ўласнае назіранне, знаёмілі з вопытам і пэўнымі стратэгіямі жыццезабеспячэння мінулага. У XIX – пачатку XX ст. на Віцебшчыне жыхары некаторых вёсак займаліся жабрацтвам, як дадатковым промыслам. Напрыклад, на Полаччыне былі вядомы "Махіроўскія старцы" – насельніцтва вёскі ("ад малага да вялікага"), якое займалася жабрацтвам і па класіфікацыі М.Я. Нікіфароўскага адносілася да "кірмашовых старцаў" [1, с. 29]. Матэрыялы вуснай гісторыі фіксуюць вяртанне да гэтай практыкі з боку навакольнага мясцовага насельніцтва ў складаныя паваенныя гады: "*…хадзілі часта – з'ядзём і пайшлі апяць…і саседзі хадзілі з намі, хадзілі*" (Полацкі р-н)[25]. Такім чынам, экстрэмальныя жыццёвыя ўмовы актуалізавалі ў калектыўнай памяці жыццёвы вопыт пра жабрацтва як пра магчымую стратэгію выжывання.

Успаміны пра пасляваеннае жабрацтва дэманструюць запатрабаванне ўніверсальных схем прашэння міласціны (спецыфічнасць знешняга выгляду, паводзін і маўлення), а таксама і тое, што ўласны досвед і абмен вопытам рабіў іх больш эфектыўнымі. Разам з тым, трэба адзначыць, што як і ў XIX ст., так і ў XX ст. жабрацтва для адных было вымушанай часовай практыкай, для другіх – адмысловай канцэпцыяй жыцця, для трэціх – эфектыўнай стратэгіяй жыццезабеспячэння, якая ў параўнанні з працай у пасляваенным калгасе, прыносіла гарантаваны прыбытак у сямейны бюджэт пры меншых працоўных выдатках. Успаміны вяскоўцаў пра выпадкі, калі жабрацтва станавілася прыярытэтным заняткам у працівагу працы ў калгасе, падцвярджаюцца архіўнымі

---

[19] ФА ПДУ : Зап. Аўсейчык У. у 2019 г. ад Шымуковіча Фадзея Лаўрэнцьевіча, 1935 г.н., г. Дзісна Міёрскага р-на.

[20] ФА ПДУ : Зап. Жукаў Д, Мякшыла М. у 2019 г. ад Грыдзюшка Веры Фадзееўны, 1933 г.н., в. Іст Міёрскага р-ну.

[21] ФА ПДУ : Зап. Сумко А., Наркеўскі А., Саланевіч А., Якубёнак І. ад Глафіры Цімафееўны Бабакі, 1927 г.н. у г. Дзісне Міёрскага р-на.

[22] ФА ПДУ : Зап. Лобач У. у 2019 г. ад Пішчулёнак Марыя Сцяпанаўна, 1936 г.н. у г. Дзісна Міёрскага р-на.

[23] ФА ПДУ : Зап. Лобач У. у 2019 г. ад Тэклі-Тэрэзы Патрымайла, 1929 г.н. у г. Дзісна Міёрскага р-на.

[24] ФА ПДУ : Зап. Жукаў Д, Мякшыла М. у 2019 г. ад Фурс Яўгенія Іосіфавіча, 1930 г.н., в. Іст Міёрскага р-ну. Неабходна адзначыць, што ў прыведзенай цытаце, вынікаючы з-за спецыіфкі індывідуальнай памяці, хутчэй за ўсё супалі два перыяда няўроду: 1946 г. (засуха) і пачатак 1950-х гг., калі дажджы знішчылі ўраджай у рэгіёне.

[25] ФА ПДУ : Зап. у 2019 г. ад Гураўчанка Валянціны Грыгор'еўны, 1928 г.н. у в. Махірова (нар.у в. Асяродкі) Полацкага р-на.

дакументамі. Напрыклад, у сакрэтным лісце ад 23.01.1945 г. на імя старшыні Расонскага сельскага савета ад аднаго з падраздзяленняў дзяржаўнай бяспекі ўтрымлівалася выпіска з прыватнага ліставання пра гаротнае становішча сям'і, члены якой некалькі разоў хадзілі жабраваць у Латвію: "Дорогой брат Пётр я буду просить, чтобы ты помогал нам в жизни. На сегодняшний день имеем три пуда муки и с этим запасом придется жить весь год. Видимо придётся умирать с голода! Мама вместе с Ваней уже пошли третий раз в Латвию собирать по-миру и оттуда приносят куски хлеба. Тяжелое время." [12, л. 36]. У выніку праверкі было выяўлена, што працаздольныя члены сям'і амаль не прымалі ўдзелу ў палявых работах, а замест працы ў калгасе хадзілі ў Латвію: "мы пражывем і без вашага калгасу" [12, л. 38].

Матэрыялы вуснай гісторыі Віцебшчыны сведчаць пра тое, што мадэлі паводзін выбіраліся жабракамі з улікам асаблівасцей успрымання тых, да каго яны звярталіся. Напрыклад, можна заўважыць выбарчую практыку выкарыстання рэлігійных сімвалаў. Ва ўсходніх раёнах, дзе ваяўнічны атэізм, інспіраваны дзяржавай, панаваў больш працяглы перыяд, дэманстрацыя набожнасці амаль не практыкавалася: "А вот пасля вайны ці хадзілі старцы, жабракі? Ці былі такія, што вот яны памаліцца ўмелі? – *Нет, гэта так не было, што прыхадзілі маліліс – не, а так, бедныя. Прасілі, бедныя прыхадзілі*"[26] (Полацкі р-н). Што датычыла заходніх раёнаў, то апеляцыя да рэлігійнай свядомасці гаспадароў была надзвычай актуальная: "*Мы не хадзілі, а да нас пасля вайны з васточнай Беларусі прыхадзілі. Яны ж там папаленыя былі, бедна жылі, так ішлі да нас. Прыйдуць, паглядяць ёсць ці абраз, перакрэсіцца і "Падайце радi Хрыста"…і так ішлі, ішлі, ішлі…*"(Глыбоцкі р-н)[27]; "*Пасля вайны ж многа хадзілі, мая мамка нікому не адказвала. Дажа паследняе бывала і хлябок аддасць, не магла адказаць. Хадзілі, карміла і супам, што ёсць, тым і карміла.* – Дык гавораць, што божыя людзі, вот хоць што ды трэба даць. – *Ну яны ж і прыхадзілі ўсягда і прасілі падарыце радзі Хрыста. І хадзілі ж пасля вайны, многа хадзіла, очень многа*"[28] (Глыбоцкі р-н); "*Прыйдзець, перехрэсіцца ў парозе стая і кажаць:"памілуйце мяне, дайце мілыстыню", ну і ўсе, што яны скажуць, перахрэсіюцца і ўсе, сама сабой пашэпчыць, і кажаць дайце паесць, нада сям'ю карміць*"[29](Міерскі р-н).

Неабходна адзначыць, што ўспаміны пра "класічных старцаў", якія лячылі ці выконвалі магічныя практыкі, насілі адзінкавы характар: "*Мяне фугасная бомбачка была ранеўшы. Ой, як доўга мучалася, а тады ж хадзілі бедныя: і рабяты і старыя, пабіраліся, гэта не з нашай стараны, а з той, там жа фронт прайшоў. А тады к нам прыйшла старэнькая бабка: "пройдзець можа тры дні, я прыйду я вылечу". Прыйшла і прыносіць такі пучок травы, такая сівая трава, як цяпер гляжу, гаворыць: "дай мне дзетка якой не будзь чарапочак, адбіты там што не будзь". Яна спаліла гэту траву, тады гаворыць: "У цябе кароўка ёсць? Дай мне салодкай сметанкі троху, каб салодкай, самый вяршок". Размяшала яна гэта, ну гаворыць, дай нагу. Бажачкі, як яна мне памазала нагу, я думала, што я кончуся. Балела, як жа ж балела, біла пена…. і вот толькі яна мяне вылічыла. Яна доўга ў нас жыла, а тады пайшла і болі не прыйшла.*"[30] (Міёрскі р-н). Улічваючы спецыфіку крыніц, можна дапусціць, што рэспандэнты ўзгадвалі з'яву, якая штодня кідалася ў вочы, аднак, па сутнасці палявыя матэрыялы фіксуюць, што размова ўжо не вядзецца пра жабракоў, як пра нейкую адмысловую сацыяльную групу, а пераважна пра жабрацтва вымушанае.

Праз уласны досвед ці абмен вопытам выпрацоўваўся пэўны алгарытм, які забяспечваў эфектыўнасць жабрацкай практыкі і пэўную прафанацыю сакральнага статуса "класічных старцаў". Выкарыстоўваючы веру людзей у тое, што жабрацкая памінальная ці "заздраўная" малітва дойдзе да Бога хутчэй, пасляваенныя жабракі хадзілі ў хрысціянскія святы і памінальныя дні, збіраліся перад касцеламі ці цэрквамі: "*Я помню после вайны і к нам прыхадзілі, там Дзедзіна ёсць дзярэўня, дык маміна сестра жыла там, дваюрадная. І там яе знакомая, дык яна после вайны хадзіла, як цяпер сказаць, жабраваць хадзіла. У яе было трое дзяцей, Дзедзіна – гэта было дзярэўня спалена, яна была беднай, яна хадзіла далёка жабраваць, за Парфенава туды, а тады ідзець, толькі як пераваліцца цераз парог хаты: "Ай, Зоська, ай умарылася", і палезіць к бабулі на печ.* – А вот гэтыя людзі, каторыя хадзілі, яны ж і паміналі памерлых? – *Паміналі. Дык во гэтая самая з Дзедзіна, дык сама ужо знала нас… раней было, вот гэта і мама казала і свякроў, што нада на Каляды, як первы дзень, у цэркві, дык там многа сядзіць этых нішчых, і нада тады ўзяць па кусочку сала па невялікаму, каб усім даць*"[31] (Докшыцкі р-н). Трэба адзначыць, што ўзаемаадносіны з навакольным светам былі абумоўлены існуючай сістэмай культурных кодаў, якія глыбока фіксаваліся ў свядомасці кожнага чалавека, цесна перапляталіся з жыццёвымі абставінамі і афармляліся ў ментальныя схемы, што ўплывалі на будзённыя практыкі. Так, традыцыйная карціна свету вяскоўцаў не дазваляла адмаўляць жабракам, бо лічылася, што жабрак – гэта "божы чалавек": "Прыходзілі жабракі, да. Ім нада тожа даваць. Што б абязацельна іх не упускаць і даваць ім, што палучшэ, што сам ясі – то і даваць. Эта Бог жабракоў прысылаець"(Віцебскі р-н ) [13, с. 271];"*Даўна Бог хадзіў па свеце, выпрабоўваў людзей, ён хадзіў у відзе жабрака. Бубуля наша расказывала, ён у відзе жабрака быў. Ён прыйдзіць і як бы начаваць просіцца, хто пусціць, хто падасць яму паесці, а некаторыя ідзі-ідзі, там хоць і можна і ѐсць, дзе яму і паначаваць і палажыць дзе, а ні хацелі гэткіх прынімаць старых, як ѐн увідзе жабрака там*

[26]ФА ПДУ : Зап. Лобач У. у 2019 г. ад Нікалаевай Надзеі Афанасьеўны 1932 г.н. у в. Шпакоўшчына Полацкага р-на.

[27] ФА ПДУ : Зап. Мяховіч П. ад Рабкоўскага Віктара Нікалаевіча 1933 г.н. у в. Кавалеўшчына Глыбоцкага р-на.

[28] ФА ПДУ : Зап. Лобач У., Сумко А. у 2018 г. файл 180923_003, в. Чарневічы Глыбоцкага р-на.

[29] ФА ПДУ : Зап. Аўсейчык У., Цыганкова А., Апанасёнак А. у 2019 г. ад Кукуць Марыі Леанідаўны 1932 г.н. у в. Перабродзе Міёрскага р-на.

[30] ФА ПДУ : Зап. Сумко А., Якубёнак І.,Саланевіч А. у 2019 г. ад Стомы Яўгеніі Мікалаеўны 1931 г.н. у в. Клімяты Міёрскага р-на.

[31] ФА ПДУ : Зап. Аўсейчык У. у 2011 г. ад Малюжанец Марыі Уладзіміраўны 1933 г.н. у в. Таргуны Докшыцкага р-на.

*тады ўжо брэзгавалі гэткімі людзьмі, не пускалі і вот, гэта ўжо шчытаюцца неблагачысцівы чалавек"*[32] (Докшыцкі р-н). Уплыў ментальных схем на будзённыя практыкі фіксуецца не толькі ў заходніх раёнах: " – Ну, а вот ім абязацельна даць хоць што? – *Да, абязацельна давалі. Хоць што, там гаворыш, што у нас саміх нічога, а усё роўна далжны даць. Далжны даць, давалі-давалі"*[33] (Полацкі р-н).

**Заключэнне.** Матэрыялы палявых даследаванняў фіксуюць, што большасць успамінаў пра пасляваеннае жабрацтва на тэрыторыі Віцебшчыны – гэта сведчанні пра жабрацтва вымушанага характару, якое дапамагала выжыць у складаных эканамічных умовах. Што датычыла прафесійнага жабрацтва, то ўспаміны пра "класічных старцаў", якія выконвалі рытуальныя ці магічныя практыкі, маюць адзінкавы характар і па сутнасці размова ўжо не вядзецца пра нейкую адмысловую сацыяльную групу. Палявыя матэрыялы сведчаць пра пераемнасць мадэляў паводзін, прынятых ў субкультуры дарэвалюцыйных жабракоў і ўзнаўленне традыцый этнічнага вопыту выжывання ў неспрыяльных умовах. Для жыхароў знішчаных вёсак жабрацтва было адной з эфектыўных пасляваенных стратэгій жыццезабеспячэння. Прашэнне міласціны давала магчымасць не толькі пазбегнуць галоднай сьмерці, але і атрымаць рэсурсы для аднаўлення асабістай гаспадаркі. Жабрацкія маршруты залежалі ад розных фактараў: геаграфіі пражывання, фізічных магчымасцей, узросту, сямейных абставін. Жабраваць хадзілі ў раёны, якія найбольш ацалелі пасля вайны – пераважна ў заходнюю частку Віцебшчыны, якая была ў параўнальна лепшай гаспадарчай сітуацыі, чым разбураныя ўсходнія раёны. Гэта, у сваю чаргу, актуалізавала падзел на "заходнікаў" і "ўсходнікаў" з шырокім спектрам узаемных сацыякультурных стэрэатыпаў.

Матэрыялы вуснай гісторыі Віцебшчыны сведчаць пра тое, што жабрацкія мадэлі паводзін выбіраліся з улікам асаблівасцей успрымання тых, да каго жабракі звярталіся. Дэманстрацыя набожнасці жабракамі з мэтаю больш эфектыўнага збору міласціны найбольш практыкавалася ў заходніх раёнах рэгіёну, насельніцтва якіх вылучалася высокім узроўнем рэлігійнасці. Аднак, незалежна ад геаграфічнага складніка, трывалыя традыцыйныя ментальныя схемы ўплывалі на будзённныя практыкі ў адносінах да тых, хто прасіў міласціну, і не дазвалялі адмаўляць "старцам".

## ЛІТАРАТУРА

1. Никифоровский, Н.Я. Очерки Витебской Белоруссии / Н.Я. Никифоровский ; предисл. и сост. А.П. Ащенко. – Минск : Беларусь, 2019. – 271 с.
2. Лобач, У.А. Міф. Прастора. Чалавек: беларускі традыцыйны ландшафт у семіятычнай перспектыве / У.А. Лобач. – Мінск : Тэхналогія, 2013. – 511 с.
3. Рыбкин, М. Деревенское нищенство / М. Рыбкин. – СПб. : Паровая Скоропечатня Я. И. Либермана, 1895.
4. Зубкова, Е. «Бедные» и «чужие»: нормы и практики борьбы с нищенством в Советском Союзе. 1940 – 1960-е годы / Е. Зубкова // Труды Института российской истории РАН. – 2013. – Вып. 11. – С. 285–310.
5. Кометчиков, И. Традиция якутальства как грань "социального иммунитета" калужской деревни и борьба с ней в 1930-е – начале 1960-х гг. / И. Кометчиков // Антропологический форум. – 2014. – № 20. – С. 240–340.
6. Кашталян, І. Голад у БССР 1946–1947 гг. ва ўспамінах сведкаў часу / І. Кашталян // Восень 1939 года ў гістарычнай традыцыі і вуснай гісторыі / Пад рэд. д-ра гіст. н. А. Смаленчука. – Мінск : Зміцер Колас, 2015. – С. 244–249.
7. Шумскі, Ян. Саветызацыя Заходняй Беларусі (1944 – 1953 гг.) / Ян Шумскі. – Беласток : Беларускае гістарычнае таварыства, 2012. – 362 с.
8. Витебщина освобожденная: октябрь 1943 – декабрь 1945 : док. и материалы / сост. Н.В. Воронова [и др.]. – Витебск : Витеб. обл. тип., 2009. – 584 с.
9. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4-п. Воп. 29. Спр. 267.
10. Занальны дзяржаўны архіў горада Полацка (ЗГА г. Полоцка). – Ф. 1093. Воп. 1. Спр. 9.
11. Сумко, А.В. Выжыванне пасля вызвалення: вёска Паўночнай Беларусі ў дыскурсе вуснай гісторыі / А.В. Сумко // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А, Гуманитарные науки.– 2019. – № 9. – С. 65–72.
12. ЗГА г. Полоцка. – Ф. 1093. Воп. 1. Спр. 16.
13. Полацкі этнаграфічны зборнік. – Вып. 2. Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. / Уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 2. – 368 с.

*Пастуліў 14.05.2020*

## THE POST-WAR BEGGARY IN THE DISCOURSE OF THE ORAL HISTORY OF VITEBSK REGION

***A. SUMKO***

*The post-war beggary is considered a special practice in the life support system of the village population in difficult economic conditions. The sources were oral history materials, which allowed to understand the specifics of the chosen problem and to characterize the peculiarities of representation of the phenomenon of the postwar extreme poverty in the collective memory of the village population of Vitebsk region.*

***Keywords**: post-war village, oral history, Vitebsk region, beggary, elders, hunger, life support system.*

[32] ФА ПДУ : Зап. Аўсейчык У. у 2011 г. ад Малюжанец Марыі Уладзіміраўны 1933 г.н. у в. Таргуны Докшыцкага р-на.
[33] ФА ПДУ : Зап. Лобач У. у 2019 г. ад Нікалаевай Надзеі Афанасьеўны 1932 г.н. у в. Шпакоўшчына Полацкага р-на.